Бялько, Ж. На стыку гісторыі і легенд: назвы вёсак відзаўскай акругі / Ж. Бялько // Браслаўская звязда. – 2021. – 2 ліп. – С. 3.

**На стыку гісторыі і легенд: назвы вёсак відзаўскай акругі**

***«Браслаўская звязда» працягвае далучаць сваіх чытачоў да таямніц мінулага нашай мясцовасці праз тлумачэнне найменняў населеных пунктаў. Гэтым разам у цэнтры ўвагі – назвы вёсак Відзаўскага сельсавета. Публікацыю мы падрыхтавалі сумесна з юнымі даследчыкамі з Браслаўскай гімназіі Палінай Адахоўскай і Кірылам Гулецкім, якія пад кіраўніцтвам настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Аксаны Сіўко таксама вывучалі найменні ў дадзеным рэгіёне.***



Самадзейны мастак Ян Рыдзіка ўвасобіў старадаўняе паданне пра паходжанне назвы мястэчка Відзы ў карціне.

На тэрыторыі Відзаўскагіа срльсавета, дарэчы, самага вялікага ў Беларусі, размешчана больш як 100 населеных пунктаў. Самы буйны з іх – гарадскі пасёлак Відзы.

Пра яго заснаванне і паходжанне назвы існуе цікавае паданне. Кажуць, нібы шмат гадоў таму назад праз гэтую мясцовасць ехаў аднойчы пан са сваёй дачкой, зграбнай і прыгожай дзяўчынай, але сляпой з маленства. Ніводзін лекар, да якіх вазіў яе бацька, не змог дапамагчы. Здарожыліся пан з паненкай і спыніліся адпачыць у прыгожым месцы пад дубамі, каля крыніцы. Дзяўчына, пачуўшы журчанне вады, абмыла ёй твар і нечакана ўбачыла святло: крынічная вада аказалася гаючай. Паненка ўскрыкнула: «Відзай! Відзай!», што азначала «Бачу! Бачу!». Узрадаваны бацька ў знак падзякі паабяцаў побач з крыніцай пабудаваць касцёл. З часам каля ўзведзенага храма пачалі сяліцца людзі – так і ўзнікла мястэчка, якое назвалі Відзы.

Праўда, вучоныя прытрымліваюцца іншай версіі і лічаць, што найменне пасёлка паходзіць ад фіна-ўгорскага слова «відзэ», што ў перакпадзе азначае «сенажаць, пакос». Яшчэ ёсць меркаванне, што відзамі называлі жыхароў латвійскай вобласці Відземе, якія пасяліліся ў гэтай мясцовасці.

У значнай колькасці найменняў вёсак, размешчаных на тэрыторыі Відзаўскага сельсавета, яскрава прасочваюцца геаграфічныя і прыродна-кліматычныя асаблівасці гэтых зямель. Так, відавочна, што Баравыя, Баркаўшчына, Дубраўка і нават Зацішша ўзніклі паблізу лесу, Азярава і Астравішкі звязаны з вадаёмамі, Барсукі, Ваўкі, Гадаўшчына адлюстроўваюць жывёльны свет, Марозаўка і Снегішкі – кліматычныя адметнасці, а Чарназем'е – глебу.

Назвы некаторых населеных пунктаў маюць асаблівую каштоўнасць для даследчыкаў, бо захавалі да нашага часу ўказанне на пэўныя віды вытворча-гаспадарчай дзейнасці, якой займаліся нашы продкі, – Перавознікі, Казарэзы, Канавалы, Мельнікі і г. д. Характарызуюць мясцовых жыхароў Гультаёўшчына і Манюкі, хоць і не з лепшага боку, а таксама Пузава і Галавачы.

Белы Засценак і Чорны Засценак, у сваю чаргу, утрымліваюць сацыяльны сэнс. Даўней паселішчы будавалі альбо на «белых» землях – панскіх, альбо на «чорных», якія з'яўляліся ўласнасцю сялянскай абшчыны і абкпадаліся падаткамі. Адсюль засценкі атрымалі адпаведныя назвы. Пра тое, што вяскоўцы жылі небагата, сведчыць і тапонім Галалаўкі.

Шэраг найменняў звязаны з імёнамі і прозвішчамі першапасяленцаў, заснавальнікаў ці ўладальнікаў населеных пунктаў – Паўлаўка, Кузьмішкі, Грыгараўшчына, Казімірова, Плетарова і інш.

Зрэдку ўзгадваюцца этнічныя групы – Латышкі, Германоўшчына.

Багата сустракаецца так званых непразрыстых найменняў, якія не суадносяца з вядомымі нам словамі. Увогуле назвы вёсак Відзаўскага рэгіёна зведалі моцны ўплыў балтыйскіх моў, асабліва літоўскай: нездарма так часта ў найменнях сустракаецца ўласцівы ёй суфікс -ішкі – Леанішкі, Юлішкі, Груштэлішкі.

**Жанна БЯЛЬКО.**